
КАЛІВА

№17

31 СНЕЖНЯ 2000 г.

Бюлетэнь Берасьцейскага абласнога Цэнтра падтрымкі грамадзянскіх ініцыятываў "Вежа"

Шаноўныя сябры!



Напрыканцы XX стагоддзя ў краіне, дзе, мягка кажучы, не зусім усё добра з забеспячэннем правоў чалавека, мы з вамі займаліся вельмі цяжкай і паважнай справай - пабудовай грамадзянскай супольнасці. У сапраўдных «зімовых умовах» мы рабілі тое, што падказвала нам наша сэрца, наша сумленне, наша годнасць. Але зіма толькі крок, стадыя ў цыкле жыцця. Мы штодзень працуем з жыхарамі трэцяга сектара Берасцейшчыны і адчуваем цеплыню іх сэрцаў. І таму сёння не можам уявіць сабе лепшай долі, чым хуткая сустрэча разам вясны, вясны трэцяга тысячагоддзя, вясны пераменаў і новага жыцця. Прасторы для вашага Я, шчасця, здароўя, кахання і поспехаў ва ўсіх вашых пачынаннях. Трымайцеся, і хай на вашых вуснах заўжды гуляе ўсмешка!!!

Заўсёды з Вамі ———— *Вашыя Вежаўцы.*

Бібліяграфія трэцяга сектара Берасцейшчыны

1. «Ад з'езда да стварэння незалежнай рэспублікі Палессе адно прэзідэнцкае слова». - Выд. «Прасвіта Берасцейшчыны».

2. «Людзі гінуць за метал, альбо як зарабіць на сярэднявеччы». - Ксеракапаваны рыцарскі эпас. Выд. «Берасцейская харугва».

3. «Кляштарызацыя беларускай гісторыі». - 3 серыі «Цаглінай па кумпалу». Выд. «Стары горад».

4. «Леў, які ўразіў Швецыю». - Заалагічныя вандроўкі па паўночным камунізме. Выд. «Фонд Сапегі».

5. «Калі выбіраць паміж вадой з крана і вадой са студні я б выбраў кока-колу». - Сакрэты эколагаў. 3 серыі «Жывая зямля» ў арміі».

6. «Вы шалееце? Мы дапаможам Вам зрабіць гэта прафесійна». - Кніга ў 2-х частках. Ч.І. «Другое нараджэнне харызмы». Выд. «Гера».

7. «Змяні булыжнік на пейджер і быць можа цывілізацыя ў нас пераможа». - 3 серыі «Адмарожаны енк. Гісторыя Ха». Выд. «Малады Фронт».

8. «Сціплае абаянне кансерватызму». - 3 серыі «Пазняк юбер алес». Выд. «КХП».

9. «Вольныя рабы рынкавага сацыялізму». - Песні падземных жыхароў. Выд. «Свабодныя прафсаюзы».

10. «Смяецца той, хто смяецца крайні». - Серыя «Пакахайце Радыкала». Выд. «Край».


11. «Праз дэбаты ў зоркі рэкламнага бізнэсу». - Серыя «Раскіданае гняздо». Прыват. выдавецтва Войцішка & К.

12. «З гэтай пары я пачаў углядацца ў твары людзей і ў скрыні глядзець». - Зборнік вершаў для наглядальнікаў. Выд. «Усебеларускі клуб выбаршчыкаў».

13. «Сацыялагічная дэзарыентацыя насельніцтва як пошук новай парадыгмы». - 3 серыі «Прэпарыраванае грамадства». Выд. «Логас».

14. «Інтэлектальнае паленне супраць інтэлектуальнага п'янства». - 3 серыі «Разам з Мінздравам». Выд. «Інтэлект».

15. «Крыжовы паход з прэзерватывам альбо let the beat control your body». - Нарысы палавога жыцця беларусаў у 13-ці позах. Выд. «КДЖ».




16. «Польскія вандроўкі беларускіх перфоманаў». - Карта-схема. Выд. «Бергамот».

17. «Паспрабуйце скласці на мяне пратакол і пра гэта будзе ведаць увесь свет». - 3 серыі «Чалавек з праваабарончым тварам». Выд. «Вясна».

18. «Галасы пад сярпом тваім». - 3 серыі «Па слядах пружанскіх міфаў». Выд. «Язэп Яравіт Вялікі».

19. «Друкаваныя арыенціры». - 3 серыі «Доўгі шлях да выдання». Выд. «ГНОМ».

20. «Наша слова абавязкова вернецца». - Выд. «Прэсбумеранг».



21. «Перакладзі Еўропу ў Беларусь і наадварот». - 3 серыі «Прымусовая ін'екцыя еўрапейскасці». Выд. «Pro Europa».

22. «Не пакідайце імя ваша, каб не ўмёрлі». - 3 серыі «Шляхамі дэзінтэграцыі». Выд. «Дзе дзіч».

23. «На прэзідэнцкіх франтах без перамен». - 3 серыі «Вячоркі нацыяналістаў». Выд. «БНФ».

24. «Падкіньце Брусэльскай капусты». - Таемная перапіска паўночна-атлантычнага альянса са сп. Самойленка. Выд. «Сябры НАТА».

25. «Мір Вам, ці пошук мастацка-гістарычнай натуры». - Серыя «Адчыні браму ў сваю падсвядомасць». Выд. «Этнаграфічная крынічка».

26. «Мовай па языку». - Слуханне філалагічнай судовай справы ў межах баранавіцкага круглага стала «Густая лаянка супраць нецензурной брани». Выд. «ТБМ».

27. «Светлае з'яўленне аддзела юстыцыі». - 3 серыі «Непажаданы візіт». Выд. «Святліца».

28. «Лепш дзірка ў кішэні, чым дзірка ў нябёсах». - Катрэны сучасных эколагаў Частка ІІ. Серыя «Хутка гэта ўсё скончыцца». Выд. «Неруш-цэнтр».

29. «Выхаванне рэгіянальнай нябачнасці». - 3 серыі «Маўклівыя сведкі Баранавічаў». Выд. «Варута».

30. «Рым - Нью-Блудэнь - новы перспектыўны праект блудэнскіх папарацы». - Схемы і план пабудовы міжнароднага аэрапарта з пралогам і эпілогам. Выд. «Блудэнскі кур'ер».

31. «Імперыя» наносіць удары па сэрцах». - 3 серыі «Ныркі ў пралёце». Сумеснае выд. «КОРС - Мы Разам».

32. «Ну, і вось яно XXI стагоддзе, і што зараз з ім рабіць». - Працяг разважанняў у 20-ці тамах. Т. 2. «Пінскія футуралагічныя канцэпцыі». Выд. «Цэнтр XXI стагоддзе».

33. «Гендэрныя войны». - Энцыклапедыя невядомай вайны ў 5-ці частках. Ч. І. «Кухня, царква і дзеці - для мужчын». Выд. «Жаночая ліга».


34. «Ліквідаваць прэзідэнцкі бюджэт. Лепшае - дзецям». - 3 серыі «Уклад у дзяцінства - абавязак кожнага». Выд. «Эмпатыя».

35. «БАРЦ, БАРЦ, БАРЦ - унасі гатовага, хто на новага». - 3 серыі «Невычарпальныя рэсурсы гаротнай Беларусі». Выд. «БАРЦ».

Галоўны бібліёграф Алесь Сцёб

ПРЭЗІДЭНЦКА-ЕЎРАПЕЙСКІ ДЫЯЛОГ

У МАЛЮНКАХ



* * * Кружацца над вуліцай два крумкачы і бесперапынна гадзяць на прахожых. Гадзіна, дзве - але ўсё безвынікова: аніводнага траплення ў цэль.

Раптам з'яўляецца верабей: першая спроба - нейкай кабеце на капялюш, другая - мужыку на твар, потым віраж - і яшчэ двое трапілі пад абстрэл. Усіх абгадзіў.

- Як гэта ў цябе атрымоўваецца, - са здзіўленнем пытаюцца крумкачы.

- Не ведаю, але ў былым жыцці я быў журналістам.

Анекдот быў прысвечаны газеце «Вячэрні Столін».

«РАДЗІВІЛ»

* * *

«У мяне нават пыталіся: «Алесь, «МФ» акрамя гульні ў футбол, што-небудзь рабіць можа?» і зараз я магу сказаць: канешне можа. Напрыклад, нядаўна я пабачыў наколькі «МФ» моцны, калі пад час футбольнага матчу «Маладая Грамада» не здолела нават сабраць адну каманду, а у нас было тры склады».

Вытрымка з інтэрв'ю.

«МОЛАДЗЕВАЯ ДУМКА»

* * *

* * * Пытанне спартоўцу нумар адзін: «Ці павінен суддзя плаціць падатак з хабару».

- Калі гэта чэсны і парадачны суддзя, то павінен.

«ТАЙМ-АУТ»

* * *

* Мальчик боялся глубины и поэтому плавал на берегу.

* Троекуров был хотя и глуп, но с приветом.


* На перевёрнутой лодке сидели две девочки кверху килем.

* Дед вылечил зайца и стал жить у него.

* «Нос» Гоголя наполнен глубочайшим содержанием.

* Толстой с большой любовью описал скупость и забитость русского народа.

«ЭХО»



- Сейчас выйдешь за дверь и будешь там отсутствовать!

*

Они долго решали, убивать его или казнить.

*


- Можно выйти?

- А заодно и тряпочку намочи!

*

- Эй, вы! Две молекулы на задней парте!

*



- Ты за весь урок не сказал ничего умного!

- Гипотенуза.

*

Усе кідалі кветкі ветэранам, якія прыемна пахлі.

«LYCEUM»

* * *

Ловушка для тараканов.

Берём три яйца и две картофелины. Варим всё это три часа и для вкуса добавляем борную кислоту.

Примечание. Ловушка действует в малых радиусах. Для нейтрализации таракана скатываем продукт шарики и пытаемся попасть в морду этой сволочи.

Экономные беляши.

Идёте в гастроном и покупаете 6 беляшей. Ради экономии кефиром можете не запивать. И без него заболит живот и вам не захочется есть, а отсюда и экономия.

Рецепты от **«ГНОМа»**

* * *

9-00 - 10-00 ... А вось і першы наведвальнік. Па словах маёй суседкі-назіральніцы, мясцовы алкаш. Ох ты, які актыўны!

10-00-11-00 Нейкі жах! Бабулькі штурмуюць выбарчы участак. Ім і есці не давай, толькі дазволь на выбарах патусавацца. Адна з іх не здолела ўзняцца на другі паверх і пачала патрабаваць, каб скрыню прынеслі ўніз. Сляпы дзядуля даканаў усіх: «Я за Плецюхова! Пакажыце мне дзе выбраць Плецюхова!»

«Нататкі адаго назіральніка».

«ДЗЕДЗІЧ»

* * *

Пляшу под чужую дудку.

Очковая кобра.

*

Тату. Имитируем чистые носки.

*

Дезодорант «Жасмин» устраняет запах тела и придаёт поту свежесть и аромат.

*

В связи с закрытием ОСВОДа срочно требуются утопленники.

Доска объявлений

«ПРЕСС-БУМЕРАНГА»

* * *

* * * Сабраў Бог кіраўнікоў дзяржаваў і папрасіў паведаміць сваім грамадзянам, што неўзабаве надыйдзе канец свету.

І вось Клінтан выступае па тэлевізіі: «Шаноўныя грамадзяне ЗША! Маю для вас дзве навіны: адна добрая, другая кепская. Добрая навіна: Бог, як мы і меркавалі, ёсць! Кепская: неўзабаве канец свету!»

Пуцін: «Граждане, у меня как всегда для вас две плохие новости: Бог всё-таки есть и скоро конец света.»

Л.: «Замечацельны беларускі народ и дарагия жэншчыны! У меня для вас две прэкрасные новасци! Первая: иза всех прэзидентов Бог признал одного меня! Вторая: я буду править да канца света!»

«ПЛОШЧА»

* * *

* * * Обращается в травмпункт мужчина, обе руки перебиты, открытые переломы.

Шёл по улице в сандалиях (обувь такая), попал камушек. Мужик подошёл к деревянному столбу с черепом и надписью «Высокое напряжение», взялся за него обеими руками и начал дёргать ногой, чтобы камушек выпал.

Проходящий мимо человек схватил, как положено, сухую доску и «помог».

«САЛІДАРНАСЦЬ ЖАНЧЫН»

* * *

«... Причудливы метаморфозы судьбы. Ещё только вчера строил коровник, ругался с агрономами, копил деньги на мотоцикл с коляской. И вдруг, - личная охрана, саммит в Москве и резиденция в «Дроздах». Ещё хранит совхозный «УАЗзик» тепло августейших ягодиц, и вот уже персональный самолёт, 5(пять!) свежих сорочек в день и золотой «Паркер» - подарок от Туркменбаши...»

«КАЛЕГІУМ»

Программа Малых Грантов Всемирного Банка

В поддержку некоммерческих, негосударственных, неакадемических организаций

Если деятельность Вашей организации направлена на решение социально-экономических проблем развития: повышение уровня жизни, развитие людских ресурсов, защиту окружающей среды, развитие частного сектора – приглашаем Вас принять участие в конкурсе **Программы малых грантов Всемирного банка (ПМГ)**.

Программа, созданная в 1983 году, поддерживает мероприятия, направленные на развитие широкомасштабного диалога и распространение информации о международном развитии: конференции и семинары, выпуск специальных публикаций, аудио-видео материалы, другие совместные инновационные идеи, которые обычно испытывают затруднения в финансировании через бюджеты обычных программ.

Размер грантов варьируется от $1000 до $5000. Срок реализации программ в рамках ПМГ: **март - август 2001 года.** Программа не финансирует более половины необходимого бюджета проекта: предпочтительно, чтобы грант стимулировал получение дополнительных средств из других источников.

Ждем Ваших заявок до 20 января 2001 года

Наш адрес: Представительство Всемирного банка в Беларуси Минск, ул. Герцена, д.2А (Ст.метро "Октябрьская")

Телефон: (017) 226 52 84. Координатор ПМГ: Ирина Олейник

Предпочтение отдается программам и проектам

- Содействующим развитию диалога и/ или распространению информации о международном развитии
- Актуальным для более чем одной страны
- Способствующим объединению усилий и взаимодействию различных групп общества
- Реализующихся организациями местного уровня
- Не только определяющим проблему, но и предлагающим ее решение
- Получивших поддержку других доноров
- Имеющим опыт реализации грантов
- Не участвовавших ранее в проектах по линии Всемирного банка

Программа не финансирует

- Исследовательские программы
- Образовательные программы
- Текущие административные расходы, приобретение оборудования
- Стипендии, поездки с учебной или туристической целью

Программа малых грантов Всемирного банка не имеет официальной формы заявки, но любое обращение должно включать:

I. Информация о проекте в рамках ПМГ

- Подробное описание предлагаемого проекта
- Бюджет и информация об источниках финансирования (включая часть, финансируемую за счет ПМГ)
- Другие предполагаемые доноры (включая, если возможно, предусматриваемые суммы)
- Подробный график или план работы (включая сроки)
- Аудитория, на которую направлен проект
- Круг участников проекта, включая специально приглашаемых (если возможно, имена)
- Ожидаемый результат/ возможное продолжение проекта

II. Информация об организации-заявителе

III. Дополнительная помощь и предыдущая поддержка со стороны Всемирного банка

IV. Контакты организации-заявителя

Паважаныя сябры!

Мы запрашаем усіх аматараў фатаграфіі ва ўзросце да 17 год да ўдзелу ў конкурсе экалагічнага фота «Асяроддзе – частка мяне».

Аўтары 60 лепшых здымкаў на экалагічныя тэмы, якіх вылучыць кампетэнтнае журы, атрымаюць каштоўныя прызы і запрашэнні на нашу дыскатэку.

Тры першыя прызы – фотаапараты «Зеніт»!!!

Расклад і тэрміны правядзення конкурсу:

1 этап - збор фотаздымкаў да ўдзелу ў конкурсе – да 15 студзеня 2001 года;

2 этап - падвядзенне вынікаў, вылучэнне пераможцаў – да 1 сакавіка 2001 года;

3 этап - фотавыстава з лепшых здымкаў, узнагароджанне пераможцаў – 3 сакавіка 2001 года.

Каб стаць удзельнікам конкурсу, патрэбна даслаць на адрас Аргкамітэта заяўку (Форму можна атрымаць у Цэнтры «Вежа») і конкурсныя фотаматэрыялы.

* здымкі могуць быць чорна-белымі альбо каляровымі;
* фармат здымкаў можа быць любым, але пажадана, каб ён быў як мага большы;
* здымкі павінны быць якаснымі як па змесце, гэтак і па форме;
* колькасць фотаздымкаў ад аднаго ўдзельніка не абмяжоўваецца.

Калі ласка, дасылайце заяўкі, а таксама звяртайцеся па ўсіх пытаннях на адрас: ГАМ «Расток»

а/с 29, 224016, Брэст, Беларусь, тэл. (0162) 23-27-94, 25-81-35

Чакаем Вашых здымкаў!

З павагай ад імя Аргкамітэта конкурсу
Зміцер Трафіменка

ПРЕДЛОЖЕНИЕ ЦЕНТРА ПО ИЗУЧЕНИЮ ООН

В рамках Десятилетия образования в области прав человека ООН (1995 - 2004 г.) и в связи с Днем прав человека (10 декабря) Представительство ООН в Республике Беларусь и Белорусский государственный университет проводят акцию **"Каждый человек имеет право знать о своих правах"**. Цель акции - информирование широкой общественности Беларуси об общепризнанных правах человека и основных свободах, а также о праве и обязанности отдельных лиц, групп и органов общества поощрять и защищать эти права и свободы.

Цель акции предполагается достигнуть посредством распространения среди граждан Республики Беларусь брошюры с текстами двух основополагающих между-народных документов - Всеобщей декларации прав человека и Декларации о праве и обязанности отдельных лиц, групп и органов общества поощрять и защищать общепризнанные права человека и основные свободы. К распространению брошюры приглашаются все заинтересованные обще-ственные организации Республики Беларусь.

Указанную брошюру, вышедшую двухсоттысячным тиражом, можно заказать, заполнив заявку. Образцы заявки Вы найдете в Центре "Вежа".

Ваши вопросы направляйте по адресу: 220072, г. Минск, ул. Академическая, 25, к. 406, тел./факс: (017) 284 00 13. Менеджер проекта – Владимир Щербов.

Другое нашэсце беларускага року на Берасце

Не паспелі яшчэ берасцейскія аматары беларускай рок-культуры як след адысці ад шоку і да канца заплюшчыць расчыненыя сківіцы пасля канцэрту ў гурта “N.R.M.”, як іх зноў чакала грандыёзная акцыя мясцовых “адмарозкаў”, якія на гэты раз прывезлі дзве менскія рокавыя каманды “Нейро Дюбель” і “Крама”. У Берасці да гэтых двух канцэртаў існавала самая натуральная музычная блакада. На працягу апошніх гадоў, калі Беларусь стала на шлях пабудовы “рынкавага сацыялізму”, берасцейскі слухач мае шырокія мажлівасці паслухаць расейскамоўных выканаўцаў, такіх, як Вайкуле, Ухцінскі, Земфіра і г.д., а вось са сваімі роднымі беларускамоўнымі гуртамі пазнаёміцца было значна цяжэй. І гэта не таму, што няма ў нас добрых камандаў, іх дарэчы дастаткова, а ўся праблема заключаецца ў тым, што асноўныя перашкоды ў правядзенні такіх канцэртаў сыходзяць ад берасцейскіх гарадскіх уладаў і асабліва ад намесніка старшыні гарвыканкама сп. Працэвіча. Я ўжо нават збіўся з ліку колькі гэты чалавек паставіў сваіх подпісаў пад дакументамі, якія забаранялі беларускамоўныя канцэрты, а колькі яшчэ паставіць?





І вось, дзякуючы намаганням людзей для якіх патрыятызм не пусты гук, два канцэрты ўсё ж такі адбыліся ў Берасці ў лістападзе і ў снежні.

Першымі на сцэну палаца культуры Прафсаюзаў 15 снежня выйшаў гурт са Століну “Анархасіс”, задача якога была разагрэць публіку, якая толькі яшчэ збіралася. Пасля разагрэву, гледачоў кінулі пад халодны душ, бо наступнымі на сцэне з’явіліся Рок-каралі-98 хлопцы з “Нейро Дюбеля” і тое, што рабілі на сцэне Кулінковіч і кампанія апісанню ніяк не паддаецца. Гэта трэба было бачыць. Зала буквальна ўстала на вушы, а маладафронтаўскай ахове прышлося прыкласці шмат намаганняў, каб стрымаць фанатаў, што рваліся на сцэну. Дарэчы, ахова, якую выставіў “Малады Фронт”, была адзінай сілай ў гэты вечар якая забяспечыла парадак у залі, а міліцыя з’явілася толькі пасля канцэрту. Патанчыўшы пад дзюбелеўскі рок, гледачы працягнулі гэта рабіць і пасля таго, як да іх выйшлі музыкі з мясцовага гурта “САД”. Некаторыя самыя спрытныя нават пазалазілі на крэслы, утвараючы жывыя пірамiды на самым версе якіх луналі бел-чывона-белыя сцягі. Але вось калі на сцэне пачалі спяваць хлопцы з “Крамы”, зала ўжо не трэсла сваімі хаерамі і не білася ў канвульсіях на падлозе, а спявала разам з Ігарам Варашкевічам класічны беларускі рок-н-рол. Напрыканцы канцэрту “Крама” і “Нейро Дюбель” разам праспявалі хіт беларускіх патрыётаў “Бяжы, бяжы хлопец” і ўсё ... . Свята скончылася. Так што адзінае, што засталося берасцейскім слухачам року, гэта чакаць наступнага канцэрту, які рана ці позна мусіць адбыцца ў нашым горадзе, нават, ня гледзячы на перашкоды некаторых асобаў.

СЯРЖУК БАХУН

За што караюць смерцю чалавека?

Адзін чалавек сказаў прэзідэнту:

- Я ведаю праўду пра цябе.
- Якую праўду? – спытаў прэзідэнт.
- Ты зусім голы ў вачах людзей, - адказаў чалавек.
- Хто сказаў табе гэта? – зацікавіўся прэзідэнт.
- Праўда мне гэта сказала.

Прэзідэнт загадаў прывесці да яго Праўду.



- Гэты чалавек сцвярджае, што я голы ў вачах людзей, - сказаў прэзідэнт. – Ці гэта сапраўды так?
- Так! – адказала Праўда.
- Паглядзі на мяне ўважліва і запомні як я апрануты. Раніцай я пераапрануся ва ўсё іншае.
- Як бы ты не пераапранаўся, ты ўсё роўна голы ў вачах народа! – сказала Праўда.
- Дык гэта ты навучыла чалавека гэтым словам?
- Я! – прызналася Праўда.
- За паклёп, узведзены на прэзідэнта, прыгаворваю цябе да смяротнага пакарання! – раззлаваўся прэзідэнт і загадаў кату адсекчы Праўдзе галаву.

Схапілі Праўду і паклалі на плаху. Кат падняў сякеру, размахнуўся і рассек бервяно на две часткі. Але Праўда засталася цэлай.

- Я караю і катаў, і цароў, і прэзідэнтаў, сказала яна. – Ідзе і твой час. Рыхтуйся!
- Але на пачатку я цябе адпраўлю на той свет! – закрычаў прэзідэнт. – На вогнішча!

Прывязалі Праўду да слупа, але, калі дровы згарэлі, Праўда здаровай сышла на зямлю.

- І ў агні не гарыць! – здзівіліся людзі.

І паверылі ў бессмяротнасць Праўды.

Тады прэзідэнт запатрабаваў адсекчы галаву таму чалавеку, які першы сказаў яму праўду.

І кат выканаў загад.


Таму, калі не могуць забіць Праўду, знішчаюць чалавека, які гэтую праўду сказаў.

Заўжды і асабліва ў нас.

Злосны Гнорм

Новогодний вежавский кроссворд

По горизонтали: 1. Любимая президентская вешалка всех собак. 5. Крайняя кабинетная степень борьбы за место под солнцем. 10. Отутюженное изъятие дензнаков. 11. Рабочее место в стиле «а-ля зелень из воздуха», созвучное белорусской синей птице счастья. 14. Ну, какая от нашего президента польза, акрамя ... 15. Шкурная ценность. 16. Среда в которой способна увязнуть любая инициатива. 17. Инсценировочный выборный спектакль. 18. Фирменная бумажная боеголовка сп. Пазняка. 22. Процесс межгосударственного лобзания и лизания. 23. Зимняя категория маладафронтовца. 24. Вечно повторяющаяся устойчивая неустойчивость нашенской экономики. 26. Противная приставка. 29. Край великих зелёных мечт.



30. Правильная гарантия. 31. Грузинский сябар. 32. Массовая тусовка с политическими разборками. 33. Бодрый экшин (синема). 36. Безмозглая суворовка. 40. Удачливый сукин сын, заставивший пол мира гоняться за мышью. 42. Секс с парламентарной ориентацией (лукашенковс.). 43. Конский кидала (песенн.). 46. Модный финишный крик. 53. Европейское невнимание. 56. Необходимое число достаточное для принятия закона. 57. Мировой спасатель. 60. Крайне-элитный задавала. 63. Не наше направление. 64. 83-летняя старуха повстречавшая некогда европейского призрака. 65. Обнажённая естественность. 70. Азартная игра с подтасовкой и исправлением ноликов в крестики. 71. Подземная перемещалка. 73. Зона мокрого окружения. 74. Пиковая форма вынужденной диеты. 75. Утверждение между двумя палками. 76. Неудавшееся недоверие образца 1996г. 77. Обыкновенный белорусский хоккеист номер один, великий законотворец и пр. пр.

По вертикали: 1. Религиозный дурман. 2. Совет глухих согласных. 3. Седовласый юнец с потрясающей ложью. 4. Греческий предок легавых. 5. Основа с поправками. 6. Волосатый взяткоприёмник. 7. Юнец, восставший против американских президентов. 8. Европейско-индейский коктейль. 9. Нелегитимное законотворчество (лукашенковс.). 11. Начинка украинской шоколадки. 12. Глава под присягой (церемониал.). 13. Альянс-пугач. 19. Организация, приговорённая по уставу сражаться за власть. 20. Долбоптичка. 21. Ёмкость для организованного отсева ненужных. Часто применяется навынос. 22. Побочная сестра вестфобии. 25. Естественная накопительница камней. 27. Сориентировавшийся народ. 28. Первая из составляющих чести и совести. 29. Железное выручалово. 34. Уход проблемы на пенсию. 35. Резиновый друг закона. 37. Белорусский рок (жизн.). 38. Вознаграждение за выдумывание самой правдивой проблемы, которой до сего времени не существовало. 39. Конфликтная птицерезиденция. 41. Ударные электроны. 42. Самая грязная вещь на земле, где рождаются самые чистые обещания. 44. Общий секторный сбор. 45. Черепашьи челепаты (музык.). 47. Музэгоизм. 48. Уважаемая капуста (фин.). 49. Я в седьмой степени. 51. Невидимая пружина белорусского катапультирования неугодных. 52. Карманное несогласие. 54. Почётная портретная галерея (совков.). 55. Тайный могильщик секретов вместе с их носителями. 58. Такая же жидкость как и всякая другая (ленинск.). 59. Белорусский метод разрешения от противного. 61. Журчащий открыватель. 62. Булыжный протест. 66. НГОшное Эльдорадо. 67. Пронзительная любовь российского меча и белорусского орала. 68. Истошники. 69. Головной таран. 70. Запломбированный ленинский транспорт. 72. Форест Гамп (достоевск.).

Конституция Белобрысии



Окончание конституционного беспредела конца второго тысячелетия. Начало в №5–16

Раздел XV. Бред в отдельно взятой стране или 100 лет временным трудностям.

Арт. 218. В Республике Белобрысия система власти чрезвычайно проста: никогда ничего прямо не дозволять и никогда ничего прямо не запрещать.

Арт. 219. В Республике Белобрысия ничто не меняется так быстро как прошлое.

Арт. 220. Граждане Республики Белобрысия живут так, что внезапно увидеть их – значит поймать с поличным.

Арт. 221. В Республике Белобрысия недоверие – лучшая основа для совместной работы.

Арт. 222. Президент Белобрысии – наиболее выдающаяся посредственность нашего общества.

Арт. 223. В Республике Белобрысия молчание является самой чудовищной ложью.

Арт. 224. Резиденция президента Белобрысии самая прекрасная тюрьма в мире.

Арт. 225. Граждане Республики Белобрысия могут долго жить на обещанные им деньги.

Арт. 226. В Республике Белобрысия существуют три вида лжи: ложь, наглая ложь и статистика.

Арт. 227. Граждане Республики Белобрысия делятся на две половины: одним есть что сказать, но им не дают сказать это; другим нечего сказать, и они неустанно говорят это.

Арт. 228. Политика в Республике Белобрысия подобна колбасе: лучше не вглядываться, как её приготовляют.

Арт. 229. Президент Белобрысии в своих делах руководствуется простым законом: если не можешь сделать сам – по крайней мере, помешай другому.

Арт. 230. В Республике Белобрысия гарантировано равное распределение нищеты, а потому они увереннее смотрят в будущее.

Арт. 231. В Республике Белобрысия кто умеет, делает; кто не умеет, учит других как делать.

Арт. 232. Граждане Белобрысии всю жизнь работают на совесть, ум и честь нашей эпохи.

Арт. 233. В Республике Белобрысия за локомотивом власти как правило следует состав преступления.

Арт. 234. Граждане Белобрысии спешат делать добро. И складывать его в сундуки.

Арт. 235. Плохо когда президенту Белобрысии моча бьёт в голову. Особенно если в ней – камни.

Арт. 236. Главная черта граждан Белобрысии – черта бедности.

Арт. 237. Особенность демократии в Республике Белобрысия состоит в том, что народ здесь освободили условно.

Арт. 238. Граждане Белобрысии готовят сани летом, а «телегу» на соседа – круглый год.

Арт. 239. В Республике Белобрысия самое страшное для народа – пожелания трудящихся.



Нет, это не то что вы подумали. На самом деле это Карл Маркс (вид с тыла).

Арт. 240. В Республике Белобрысия оптические прицелы вносят поправки в Конституцию.

Арт. 241. Пройдёт немного времени и в Республике Белобрысия загробная жизнь станет ещё краше.

Арт. 242. В Республике Белобрысия только свободная пресса. Вся остальная запрещена.

Арт. 243. Граждан Белобрысии можно изнасиловать и демократией.

Арт. 244. Президент Белобрысии так крепко держит слово, что оно задыхается.

Арт. 245. На государственных политиков Белобрысии ставить нельзя. На них лучше класть.

Арт. 246. В Республике Белобрысия полноту глупости всегда скрывают за ширмой высшего образования.

Арт. 247. Мизерные оклады помогают гражданам Белобрысии быть перед Родиной вечно в долгу.

Арт. 248. Граждане Белобрысии часто оглядываются на пройденный путь. Особенно когда за ними гонятся.

Арт. 249. Президент Белобрысии выбрал наилучший способ замалчивания преступлений – долгие и изматывающие выступления.

Арт. 250. В Республике Белобрысия если бы не постоянное желание повеситься, жизнь была бы невыносимой.

Конституция Белобрысии составлена на основе поправок и предложений внесённых как невольными гражданами, так и вольными речами хозяина невольников. Ведущие юрисконсульты - Геннадий Малкин и Владимир Колечицкий. Окончательная обработка - Борис Атридес и Ян Месага.



Увага, шаноўныя чытачы! Рэдакцыя бюлетэня з усёй адказнасцю заяўляе што гэты нумар «Каліва» апошні ў гэтым тысячагоддзі. Ну, а пакуль - пакуль!

Галоўны рэдактар: Ян МЕСАГА
Карэктар: Алесь ШТЭЙН
Макет і вёрстка: Серж ШЕНДЭРОВІЧ

Пры выкарыстанні матэрыялаў бюлетэня спасылкі
на крыніцу абавязковыя.
Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў
і друкаваць артыкулы для далейшай палемікі

КАЛІВА
Бюлетэнь Берасцейскага абласнога Цэнтра падтрымкі грамадзянскіх ініцыятываў «ВЕЖА»

Адрас: г. Берасце, вул. Савецкіх Памежнікаў, 52
Тэл. (0162) 20-34-87 Тэл./факс (0162) 20-34-92
e-mail: vezhain@brest.unibel.by

Падпісана ў друк
31.12.2000 г. у 23.59
Наклад нармальны

Звярстана на настольна-выдавецкай сістэме прадзюсерскага цэнтра «Ti-rex»

Бюлетэнь Берасцейскага абласнога Цэнтра падтрымкі грамадзянскіх ініцыятываў «ВЕЖА» друкуецца на правах унутранага карыстання